## Працуем па новых падручніках

# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі

## II клас*

### *Талерка*

*1. Расшыфруйце слова і запішыце яго.*

| 5 | 7 | 6 | 4 | 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| р | а | к | е | т | а | л |

*Пастаўце націск у слове.*

*2. Дапоўніце слоўнікавымі словамі сказы.*

Маленькая ___________, якую ставяць пад кубак, — гэта сподак.

Кубак, сподак, ___________ — гэта посуд.

*3. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам. Які суп называюць крупнікам?*

**Дзедаў крупнік**

Ах! — гарачы, ох! — духмяны,
Смачны крупнічак аўсяны!
Ён смятанкаю заліты —
Есць Валера з апетытам.
Дзед жартуе: — Еш да дна,
Бо ёсць прымаўка адна:
«Хто да дна _______і дойдзе,
Той сваё здароўе знойдзе».

*Уладзімір Мацвеенка* [1, с. 13]

*Прачытайце прымаўку, якая сустрэлася ў вершы. Чаму так гавораць?*

*4. Дапішыце прапушчаныя літары ў словы.*

Та..е..ка, та..е..ачка, та..е..ачны.

*Падзяліце словы на склады вертыкальнымі лініямі (|).*

*5. Прачытайце скорагаворку. Дапоўніце яе патрэбным слоўнікавым словам.*

У сталоўцы Валерка
З'еў бульбы _____________.

*Міхась Пазнякоў* [2, с. 166]

*6. Дапоўніце загадку слоўнікавым словам.*

Мне сказаў Валерка:
Летам на градзе п н
Белая ___________ ы с
Пад лісцём расце. т а о

*Міхась Пазнякоў* [2, с. 170]

*Злучыце «рассыпаныя» літары так, каб атрымалася слова-адгадка.*

### *Сусед*

*1. Закрэсліце літару, якая сустракаецца часцей за астатнія. Расшыфруйце і запішыце слова.*

САУАСАЕАД

*2. Разгадайце рэбус. Запішыце слова, якое ў вас атрымалася.*

в = с



*Пастаўце націск у слове.*

*3. Дапоўніце прыказкі слоўнікавым словам. Чаму так гавораць?*

Добры ________ раднейшы за роднага брата.

Жыць без брата — сумна, без ______ — нудна.

*4. Дапішыце ў словы патрэбныя літары. Злучыце кожнае слова з яго значэннем.*

| | |
|---|---|
| сусе.. | размешчаны блізка |
| с..седні | блізкасць па месцы жыхарства |
| сусе..ства | чалавек, які жыве блізка, побач |

*5. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам. Падзяліце гэта слова для пераносу.*

Падарылі мне цымбалы —
Струн вясёлы перазвон.
Я зайграла, заспявала:
— Дзі-лі, дзі-лі, дзі-лі-дон!

І прыйшла сяброўка **Мая**,
І прыбег _______ **Лявон**.
Кожны гукі пераймае:
— Дзі-лі, дзі-лі, дзі-лі-дон!

*Эдзі Агняцвет* [3, с. 52]

*Растлумачце, чаму выдзеленыя словы запісаны з вялікай літары.*

*6. Дапішыце прапушчаныя літары ў словы.*

С..сед, сусе..ка, с..седзі.

*7. Дапоўніце верш патрэбным словам.*

**Чаму вожык не стрыжэцца?**

Вожык сцеражэцца
І зімой, і летам.
Можа, і не стрыжэцца
Ён з нагоды гэтай,
Бо ў яго _______________ —
Ліска Лізаветка,
А ў хітрыцы ліскі
Воўк — сваяк найбліжэйшы.

*Алесь Пісьмянкоў* [4]

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.

## Сцюжа

*1. Разблытайце «павуціну» і запішыце слоўнікавае слова.*




*Вертыкальнай лініяй падзяліце слова на склады.*

*2. Якая літара «збегла» са слова? Злучыце яе з месцам пропуску ў слове.*

т ц

с..южа

*3. Дапоўніце народныя прыметы слоўнікавым словам.*

Калі вясной птушкі садзяцца на вокны — чакаецца моцная ________.

Кот на печку — ________ на двор.

*4. Дапішыце ў словы патрэбныя літары, каб атрымаліся назвы рэчаў, неабходных для зімніх гульняў. Зафарбуйце слоўнікавае слова.*

***Цюб*** *— надуўныя санкі для катання па снезе з гары (для цюбінга).*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | к | л | |
| | | л | ы | ш |
| | ц | | | |
| а | ю | ш | ы | й |
| н | б | к | | б |
| к | | а | | а |
| і | | | | |

*5. Прачытайце радкі слоў. Якімі словамі іх можна дапоўніць?*

Холад, мароз, __________.

Халодны, марозны, __________.

***Словы для даведкі:*** сцюдзёны, сцюжа.

*Дапішыце патрэбныя словы на месцы пропускаў.*

*6. Прачытайце прыказку. Дапоўніце яе патрэбным слоўнікавым словам.*

Гаспадарлівы ні ________, ні спёкі не баіцца.

*Растлумачце сэнс прыказкі.*

*Падкрэсліце ў прыказцы словы, процілеглыя па значэнні.*

*7. Дапоўніце верш патрэбным слоўнікавым словам.*

**Пачастую птушак**

Радуе вока
Рабіна чырвоная.
Добраю думкай
Дрэва натхнёнае:
— Гронкі ад ________
Я уратую,
Птушак галодных
Зімой пачастую.

*Ніна Галіноўская* [5, с. 144–145]

## Ёсць

*1. Запішыце слова, якое ў вас атрымалася.*

,  ,, ,,,, 

*2. Прачытайце верш. Дапішыце ў слоўнікавае слова патрэбныя літары.*

Ёсц.. за хатай лес густы:
ё..ць там елкі, ёс..ь кусты,
..сць каліна, ёсц.. маліна,
ёс..ь шмат ягад і грыбоў...
Лес частуе ўсіх сяброў.

*Уладзімір Мацвеенка* [6, с. 13]

*Чым вы частаваліся ў лесе?*

*3. Дапоўніце прыказкі слоўнікавым словам. Чаму так гавораць?*

У кожным жарце ________ доля праўды.

На хаценне ________ цярпенне.

*Знайдзіце словы з гукам* [ц']. *Падкрэсліце ў словах* **ц** *разам з наступнай літарай.*

*4. Што абазначае выраз?*

**што ёсць сілы**

вельмі хутка | вельмі моцна | вельмі добра

*Злучыце выраз з яго значэннямі.*

*5. Прачытайце сказы.*

Хлопчыкі **вельмі хутка** (____________________) беглі да фінішу. А дзяўчынкі **вельмі моцна** (________________) крычалі: «Хутчэй! Хутчэй!»

*Які выраз можна выкарыстаць замест выдзеленых спалучэнняў слоў? Дапішыце гэты выраз у дужках.*

*6. Дапоўніце загадку слоўнікавым словам. Падкрэсліце літару, якой на пісьме перадаецца гук* [ц'].

У кожным доме ________, на дачы — р
На стале ці на сцяне. ю к
Яно кожнага з нас бачыць, л т а
А сябе — ніколі, не! с э

*Уладзімір Мацвеенка* [7, с. 26]

*Злучыце «рассыпаныя» літары так, каб атрымалася слова-адгадка.*

*7. Прачытайце верш. Дапоўніце яго патрэбным слоўнікавым словам.*

— Маю я адно жаданне —
Падарыць вам прыгажосць.
Не залежвайся уранні —
Для цябе сюрпрызы ________.
Глянь, як дрэўцы пагусцелі.
Падрасла за ноч трава.
Вераб'і павесялелі,
Ажывілася дзятва.

*Ніна Галіноўская* [5, с. 122]

*Падкрэсліце ў слоўнікавым слове літару, якая не абазначае гука.*

**Спіс выкарыстанных крыніц**

1. *Мацвеенка, У. І.* Сябрынка : вершы, загадкі, казкі : для мал. шк. узросту / У. І. Мацвеенка ; маст. А. І. Гармаза. — Мінск : Юнацтва, 1995. — 127 с.
2. *Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні : азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скорагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / М. П. Пазнякоў. — Мінск : Звязда, 2015. — 320 с.
3. *Агняцвет, Э.* У свеце дабрыні : зб. вершаў / Эдзі Агняцвет ; уклад.: Алена Бычко, Святлана Богуш. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2013. — 120 с.
4. *Пісьмянкоў, А.* Мы з братам : вершы, казкі : для дашк. узросту / А. Пісьмянкоў ; маст. С. Л. Рыжыкава. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. — 63 с.
5. *Галіноўская, Н. В.* Калі я шчаслівы : вершы, казкі, жарты, небыліцы : для дзяцей мал. шк. узросту / Н. В. Галіноўская. — Мінск : Звязда, 2013. — 160 с.
6. *Мацвеенка, У. І.* Займальны алфавіт : вершы, загадкі, скорагаворкі : для мал. шк. узросту. / Уладзімір Мацвеенка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. — 48 с.
7. *Мацвеенка, У. І.* Загадкі Зайкі-загадайкі : вершы / У. І. Мацвеенка. — Мінск : Юнацтва, 1990. — 32 с.

**Крыніцы ілюстрацый:** https://ae01.alicdn.com/kf/HTB18AUoKpXXXXXvXVXXq6xXFXXXw/Bzd.jpg_640x640.jpg; https://t4.ftcdn.net/jpg/01/64/79/35/160_F_164793581_CCGSzO2GxXgXXquMmhwUykFfLFhcvbNx.jpg; https://www.spokoinoinochi.ru/upload/contest/1/159.jpg; https://st2.depositphotos.com/7719420/11733/i/950/depositphotos_117332198-stock-photo-single-bast-shoe-isolated-on.jpg

***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антановіч Н. М.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*

## Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» прапануе!

**В. І. Свірыдзенка, Н. М. Антановіч**

# Слоўнікавыя словы
## Дапаможнікі для II–IV класаў




У асобных дапаможніках для II, III і IV класаў прапануюцца метадычныя рэкамендацыі па засваенні правапісу слоўнікавых слоў, каляровыя зрокавыя апоры, рукапісны варыянт слоўнікавых слоў, практыкаванні са слоўнікавымі словамі.

**Зрокавыя апоры** можна выкарыстоўваць для франтальнай работы ў класе. З апорай на малюнак арганізуецца знаёмства са слоўнікавым словам і вылучэнне ў ім неправяраемай або цяжка правяраемай арфаграмы.

**Рукапісны варыянт слоўнікавых слоў** (літары арфаграм у словах падаюцца курсівам і выступаюць часткай малюнка-апоры) пажадана раздрукаваць для кожнага вучня. Дзецям прапануецца абвесці літару (літары) неправяраемай арфаграмы з мэтай стварэння зрокава-рухальнага вобразу слова. Паступова вывучаючы слоўнікавыя словы, вучні могуць расфарбоўваць адпаведныя малюнкі. Такім чынам, у кожнага вучня з'явіцца каляровы слоўнік, які можна выкарыстоўваць не толькі падчас знаёмства са слоўнікавым словам, але і ў ходзе паўтарэння і замацавання правапісу раней вывучаных слоў.

**Практыкаванні са слоўнікавымі словамі** можна раздрукаваць для кожнага вучня. Яны выкарыстоўваюцца не толькі для выпрацоўкі арфаграфічных навыкаў, але і для замацавання вывучаемага граматычнага матэрыялу. Прымяненне розных па змесце пісьмовых практыкаванняў будзе садзейнічаць пашырэнню і ўдакладненню актыўнага слоўнікавага запасу вучняў, развіццю іх маўлення, творчых здольнасцей. Прадстаўленыя практыкаванні можна арганічна ўключаць у працу па тэме ўрока, а таксама выконваць на стымулюючых занятках. На эфектыўнасць засваення слоўнікавых слоў будзе ўплываць выкарыстанне разнастайных метадычных прыёмаў.




*Сачыце за рэкламай на сайце **www.aiv.by***
*Кнігі можна набыць у кіёску выдавецтва «Адукацыя і выхаванне»*
*ці ў інтэрнэт-краме (кнігі дасылаюцца па Беларусі накладной платай).*
*Магчымы наяўны (безнаяўны) разлік.*